# У МІНСКУ ПРОЙДЗЕ З'ЕЗД САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

**Грамадскае аб'яднанне пісьменнікаў краіны, якое сёння ўзначальвае вядомы празаік, грамадскі дзеяч Мікалай Чаргінец, — адна з найбольш прадстаўнічых творчых арганізацый Беларусі. У склад яе ўваходзяць сотні празаікаў, паэтаў, публіцыстаў, літаратурных крытыкаў з розных рэгіёнаў Беларусі.**

22 сакавіка 2022 года дэлегаты ад сямі рэгіянальных аддзяленняў творчай арганізацыі і — з Мінска, Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей — збяруцца на XXV з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі. Справаздачу за апошнюю пяцігодку літаратары будуць трымаць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Удзел у з'ездзе возьмуць каля 200 літаратараў, а таксама некалькі дзясяткаў гасцей — кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі іншых грамадскіх аб'яднанняў.

**Сяргей ШЫЧКО.**